4) крайней возможной ситуацией встречи лирического субъекта с призраком в нашей типологии является его мечтательное состояние, его сладостные мечты: видения в воспоминании — 12, тени в воспоминании — 13, призраки в воспоминании — 13, привидения в воспоминании —11.

**Заключение.** Зачастую стихотворение того или иного поэта-романтика населено «жильцами» потустороннего мира, их откровениями лирическому субъекту. Из построенной типологии видно, что во всех трех ситуациях встречи с призраком используется целая коллекция лексем, обозначающих объектов потустороннего мира: видение, привидение, призрак, тень. Примечательно, что эти объекты, являясь персонажами одного сюжетного спектра, могут воплощаться в самых различных образах, взаимозаменять друг друга, иметь различные номинативные характеристики: ангела, Гения, Верной…

**Список цитируемых источников**

1. Словарь Академии Российской : в 6 т. — СПб. : Император. Акад. Наук, 1789—1794. — Т. 5. — 1084 с.
2. Словарь языка Пушкина : в 4 т. / Рос. акад. наук, Ин-т рус. яз. им. В. В. Виноградова. — 2-е изд., доп. — М. : Азбуковник, 2000. — Т. 4. — 1187 с.

УДК 821. 163.3: 82-31

**Я. У. Кавальчук**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## МАТЫЎ СІРОЦТВА Ў АПОВЕСЦІ УЛАДЗІМІРА ЯГОЎДЗІКА «ВОЧЫ НАЧНІЦЫ»

**Уводзіны.** Сіроцтва — гэта з'ява, якая ў шырокім сэнсе характарызуе становішча дзіцяці, што засталося без апекі бацькоў. Матыў сіроцтва распаўсюджаны ў беларускай літаратуры. Пакутлівае дзяцінства пераканаўча апісана ў празаічных апавяданнях Якуба Коласа «Сірата Юрка», «Дзеравеншчына». Пісьменнік паказвае тыя ўмовы, у якіх узнікае дзіцячая беспрытульнасць, беднасць, пакуты і адзінота. Яркім прыкладам раскрыцця тэмы сіроцтва з'яўляецца апавяданне Цёткі «Сірата». Гора, адзінота галоўнай гераіні гэтага твора, Настулькі, не знайшлі спагады сярод дарослых аднавяскоўцаў. Гэтаму апавяданню ўласцівы моманты псіхалагічнай напружанасці, якія вучаць неабыякава ставіцца да сіраты. Праблема фарміравання характару хлопчыка-сіраты раскрываецца ў аповесці Я. Брыля «Сірочы хлеб». У цэнтры ўвагі пісьменніка — духоўны рост заходнебеларускага падлетка, якога выхоўвае адна маці, паказ сацыяльнага, маральнага сталення героя [1, с. 30].

Матыў — прасцейшая сэнсавая адзінка сюжэта, аснову якой складаюць дзеянні і ўчынкі персанажаў. Значэнне матыву залежыць не столькі ад пачатковага зместу, колькі ад яго ролі ў агульнай структуры твора. Тэрмін «матыў» часцей за ўсё ўжываецца як сінонім паняцця «тэма», асабліва ў дачыненні да лірычных твораў, калі неабходна падкрэсліць не толькі разумовы, але і пачуццёвы бок ідэі [2, с. 485 ]. Некаторыя даследчыкі лічаць, што матыў можа разглядацца і як частка тэмы.

**Асноўная частка.** Пераканаўча пра боль сірочага дзяцінства расказвае сучасны пісьменнік Уладзімір Ягоўдзік. Прадметам даследавання ў межах дадзенага артыкула будзе матыў сіроцтва ў яго аповесці «Вочы начніцы».

Галоўным героем аповесці «Вочы начніцы» з'яўляецца Валерык Літвінчук — падлетак, які жыве з маці, бабуляй і дзядулем. Яго бацька загінуў на вайне. Хлопчык быў тады зусім малым, таму родныя не надта хочуць яму пра гэта распавядаць. Усё, што засталося Валерыку ад бацькі, — зімовая шапка, якую прывёз дзед Павел, калі ездзіў на пахаванне [3, с. 20]. Дзяцінства хлопчыка азмрочана не толькі адсутнасцю бацькі, але і хваробай маці, прадчуваннем яе адыходу ў іншы свет. Замяніць маці спрабуе бабуля, але хлопчык мае надзею на выздараўленне маці і не хоча адмаўляцца ад яе.

Падлетак прадчувае трагічны лёс маці, але пра гэта адкрыта не гаворыць. Прадвесцем бяды становіцца амяла. Дзед наступным чынам тлумачыць хлопчыку міфічнае значэнне расліны:

— Гэта амяла, — а па-колішняму — вока Начніцы… Старыя людзі баялі, што ў амяле хаваецца Начніца, пакуль не прыліпне да чалавечай душы… [3, с. 29].

Калі Валерык даведаўся пра гэты трагічны знак, яго ахапіў жах. Спачатку хлопчык не паверыў прыкмеце, аднак назаўтра яго маці сапраўды забралі ў бальніцу. Падлетак пачынае аглядаць суседскія дрэвы, але амялу знаходзіць толькі на сваім двары. Ён пакутуе, абвінавачвае расліну ў сваім горы, не хоча верыць словам дзеда.

Маці Валерыка, цяжка хварэючы, праяўляе асаблівы клопат, ласку, пяшчоту ў адносінах да сына. Яна моцна шкадуе яго, бо ведае, што з цягам часу Валерык застанецца адзін. Хлопчык паказаны ў той момант, калі ён разумее непазбежнасць сіроцтва. Самае цяжкае — чаканне. І ўсё ж, нягледзячы на

© Кавальчук Я. У., 2019

абставіны, Валерык спадзяецца на лепшае. Ён як дарослы гаспадар прыглядае за хатай, паліць печ. Галоўная мара падлетка — вяртанне маці. Ён робіць усё, каб мужна перажыць свой боль, і скіроўвае надзею на лепшае.

Ва ўзаемаадносінах маці і сынаназіраецца поўнае разуменне, шкадаванне, шчымлівая туга, асабліва ў той момант, калі яны бачацца ў бальніцы апошні раз. Кожны з герояў адчувае, што гэта — развітанне назаўсёды.

Эпізод апошняй сустрэчы драматычны, псіхалагічна напружаны нават у побытавых дэталях: «Дзяжурная неахвотна паднялася з-за стала, схавалася за дзвярамі. Патхнула непрыемным едкім духам лякарстваў. Я замёр у чаканні, гатовы ў любы момант сарвацца з месца» [3, с. 48].

Пісьменнік па-мастацку выразна перадае цяжкі душэўны і фізічны стан маці праз апісанне яе знешнасці: «У выцвілым сівым халаце, з белай касынкай на галаве, завязанай на патыліцы. Зблажэлая, з запалымі шчокамі, подобная і не падобная на сябе. Толькі вочы засталіся такія, як і былі…» [3, с. 48].

Хлопчык выказвае сваю нязгоду з непазбежнасцю трагічных абставінаў, з тым, што ў бальніцы ляжаць выгода, што «гэта святое месца, дзе не страшна душу аддаць».

Шчымлівы мацярынскі боль, узрушэнне яскрава перадае мастацкі сінтаксіс:

— Сынок! Сынок мой!.. — моцна-моцна прыціснуўшы да сябе, мама стала абсыпаць мяне пацалункамі [3, с. 48].

Маці адчайна шкадуе сваё дзіця, якое хутка застанецца сам-насам з жыццёвымі клопатамі, без яе мацярынскай апекі.

Пры апошняй сустрэчы хлопчык перажывае страх і разгубленасць: змяняецца яго жыццё, невядома, як і што будзе далей. Даведаўшыся, што маці памерла, падлетак імкнецца расправіцца з амялою як віноўнікам смерці найдаражэйшага чалавека.

**Заключэнне.** Матыў сіроцтва ў аповесці У. Ягоўдзіка «Вочы начніцы» займае цэнтральнае месца. Жыццёвая трагедыя (страта хлопчыкам маці), увасобленая стрымана, без пафасу, прымушае чытача глыбока задумацца пра жыццё, лёс чалавека, эпоху. У. Ягоўдзік падкрэслівае асабліва значную ролю сям'і ў фарміраванні асобы чалавека, звяртаецца да праблемы выхавання дзяцей, якія засталіся без бацькоў. Пісьменнік малюе вобраз хлопчыка-сіраты як дзіцяці, якому патрэбна дапамога старэйшых, і як дарослага, які спрабуе сам кіраваць уласным жыццём.

### Спіс цытуемых крыніц


1. *Шаладонава, Ж.* Адарвалі сіраціну ад сваёй зямлі / Ж. Шаладонава // Роднае слова. — 2007. — № 10. — С. 30—31.
2. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БелСЭ, 1984—1987. — Т. 3 : Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва, Карчма—Найгрыш / І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. — 1986. — 485 с.
3. *Ягоўдзік, У.* Шчыраю ноччу / У. Ягоўдзік. — Мінск : Літ. і Мастацтва, 2009. — 271 с.


УДК 82-32

**А. А. Кондратенко**
*Федеральное государственное бюджетное образовательное учреждение высшего образования «Орловский государственный университет имени И. С. Тургенева», Орёл, Россия*

## «ЗАПИСКИ ОХОТНИКА» И «КРЕСТЬЯНСКАЯ ХРОНИКА». ВЗГЛЯД И. С. ТУРГЕНЕВА И И. Е. ВОЛЬНОВА НА СУДЬБУ КРЕСТЬЯНСТВА

**ведение**. Тема русской деревни всегда волновала русских писателей. Пожалуй, первым к ней обратился А. С. Пушкин, его продолжателем был И. С. Тургенев, который во всей полноте и неповторимости изобразил деревенскую жизнь в цикле рассказов «Записки охотника». О судьбе простого мужика и женщины писал Н. А. Некрасов. Жизнь в деревне нашла отражение не только в прозе, но и в поэзии: И. С. Никитин и А. В. Кольцов, как их называют, «певцы родного края», смогли возвеличить необъятные русские просторы, воспеть таланты и ум простого русского народа.

Начиная с И. С. Тургенева, тема деревни стала чем-то особенным для литературы Орловского края. Вслед за великим писателем до революции к ней начали обращаться М. А. Стахович (1819—1858) (рассказы «Ночное» (1860), «Святки» (1860)), П. Я. Якушкин (1822—1872) (сборник рассказов «Велик бог земли русской» (1895)), Марко Вовчок (1833—1907) («Рассказы из русского народного быта» (1859)), А. А. Брянчанинов (1839—1915) (драма из народного быта «Бездольная» (1877)), И. П. Белоконский (1855—1931) («Деревенские впечатления» (1909)), Р. В. Радонежская (50-е годы XIX века—1884) («Картины народной жизни. Записки сельской учительницы» (1877)), В. А. Цурикова

© Кондратенко А А., 2019